фактараў прышчаплення няправільнай культуры маўлення і спрыяння страце самабытнасці беларускай мовы.

З бацькамі была абмеркавана тэма працэсу словаўтварэння, запазычання і з'яўлення новых слоў, прапрацаваны асноватворныя паняцці «культура», «маўленне», «традыцыя».

У ходзе правядзення дадатковай працы з бацькамі яны паказвалі сваю зацікаўленасць у абмяркоўваемых тэмах, прызнаваліся ў некаторых «пробелах» у ведах роднай культуры.

Вынікам праведзенай працы стала 100 % згода бацькоў са сцвярджэннем пра дапамогу традыцый у развіцці маўленчай культуры, а таксама ўсведамленне імі немагчымасці поўнай адсутнасці падтрымання традыцый у сям'і ў тым ці іншым праяўленні.

Атрыманыя звесткі дазваляюць зрабіць выснову аб дапушчальнай адэкватнасці і дастасавальнасці прапанаваных тэм для прапрацоўкі з бацькамі з мэтай спрыяння развіцця маўленчай культуры дзяцей праз прызму устояных традыцый у нашым грамадстве.

Такім чынам, сучасная сацыякультурная прастора дыктуе свае правілы і ўстаноўкі па развіцці і адаптацыі дзіцяці ў грамадстве, аднак менавіта ўхіл у бок папулярызавання нацыянальнай культуры і традыцый забяспечыць усе ўмовы для захавання самавызначэння беларусаў.

ЛІТАРАТУРА:

1. Протчанка, В. У. Роднае слова – крыніца развіцця асобы, духоўнасці народа / В. У. Протчанка // Адукацыя і выхаванне. – 1994. – № 12. – С. 60–65.
2. Ушинский, К. Д. Родное слово / К. Д. Ушинский // Собрание сочинений: в 2 т. – М., 1948. – Т. 2 : Педагогические статьи. – С. 554–574.

Репозиторий ГрГМУ

## ПРЫРОДА У ТВОРЧАСЦІ Я.КОЛАСА

**Белогур Е. Ф.**

Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі універсітэт

Навуковы кіраўнік – Варанец В. І.

Якуб Колас любіў і шанаваў родную прыроду, таму ў яго творах напрацягу ўсяго жыцця можна пабачыць заклік да злітнасці з прыродай і яе цудоўнымі з’явамі. Як адзначыў літаратуразнаўца М. Мушынскі, “Колас-пейзажыст – гэта перш за ўсе мастак-філосаф, які ўмеў схопліваць жыццё ва ўсім багацці яго змен, у руху і разам з тым у яго цэласнасці” [1, с. 5].

Якуб Колас быў адкрывальнікам прыгожага і цудоўнага ў беларускай прыродзе. Так, у яго творах гучалі элегічныя песні-жальбы, сацыяльныя матывы, але разам з тым нельга не адчуць, што ён з вялікім захапленнем і любоўю паэтызаваў "вобразы мілыя роднага краю" (верш "Родныя вобразы"). Нягледзячы на сацыяльную заглыбленасць погляду на свет, Якуб Колас не

толькі пазначыў, але і магутна сцвердзіў шлях эстэтызацыі паэтычнага мастацтва, і найперш – праз лірыку прыроды. Яго пейзажная творчасць, якая жывапісна і непаўторна выяўляе прыгажосць нацыянальнага пейзажу, пейзажных вобразаў, поўніцца красой пачуццяў і красой слова, якраз і была падпарадкавана тым ідэйна-эстэтычным мэтам і задачам, якія пазней акрэсліў перад паэзіяй на пачатку XX ст. Вацлаў Ластоўскі. У артыкуле "Сплачвайце доўг" (1913), надрукаваным пад псеўданімам "Юры Верашчака", гэты вядомы "нашаніўскі" крытык і публіцыст гаварыў пра жаданне "з... твораў навучыцца бачыць каля сябе красу', заклікаў паэтаў "выяўляць красу свайго народа і краю", вучыць беларуса "любіць і разумець гоман бору, плеск вады ў сонцы...". Разам з тым у паэзіі і прозе Якуба Коласа знайшоў адлюстраванне свет беларускага Палесся. З трылогіі "На ростанях", вершаў "Палескія вобразы", "Палессе" і некаторых іншых твораў перад намі паўстае адрозная прыродная стыхія, іншыя ўмовы побыту беларуса, пры гэтым дамінантную ролю тут адыгрываюць іншыя вобразы і рэаліі ландшафту. Калі ў панямонскіх малюнках пейзажны позірк фіксуе "ўзгорачкі роднага поля, рэчкі, курганы, лясы", "поле пясчанае... між гор і лясоў", крывую дарогу "між спелага жыта", "хмызнякі, каменне", "дуб разложысты" і каля яго Нёман, то палеская рэчаіснасць паўстае іншаю – гэта "балот краіна", "гмах шырокі балот": "Цёмны бор, кусты, балоты, Куча лоз і дубняку, Рэчкі, купіны, чароты, Мора траў і хмызняку" ("Палескія вобразы"). Якуб Колас вельмі вобразна перадаваў з'явы прыроды, сузіраў і адкрываў у ёй красу, гармонію. А гэта вымагала незвычайнага ўзнясення паэтычнага духу, бо "прыгажосць мастацтва, – як адзначаў Гегель, – з'яўляецца прыгажосцю, народжанай на глебе духу, і наколькі дух і твор вышэй прыроды і яе з'яў, настолькі ж цудоўнае ў мастацтве вышэй натуральнай прыгажосці". Якуб Колас стварыў высокую паэзію прыроды, уклаў у яе глыбокую эстэтыку слова, змест свайго "я". Шматлікія прыродаапісанні паэта вельмі лірычныя, інтымныя [2].

Пейзажныя малюнкі ў творах Коласа выконваюць выключную ролю ў стварэнні яскравых вобразаў роднага краю, адлюстраванні жыцця народа, раскрыцці ўнутранага свету герояў. Па-новаму раскрываюцца гэтыя тэмы ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны, калі Якубам Коласам былі напісаны некалькі зборнікаў вершаў і дзве паэмы “Суд у лесе” (1942) і “Адплата” (1944). Дамінуючай у творах становіцца тэма абароны радзімы, новыя функцыі набывае і пейзаж. Як адзначыў М. Арочка ў манаграфіі “Паэзія і вайна”: “Прырода адухоўлена тут вялікім патрыятычным пачуццём, асобныя яе карціны створаны на ўзроўні, бадай, пейзажнага майстэрства вяршыннай эпапеі Якуба Коласа “Новая зямля”. Але ўжо з выхадам у новае светаадчуванне” [3, с. 67-68].

ЛІТАРАТУРА:

1. Мушынскі, М. І. Чалавек і прырода ў апавяданнях Якуба Коласа / М. І. Мушынскі. – Мінск: ВПП імя Я. Коласа, 1999. – 143 с.

2. Беларуская літаратура, кароткі змест, біяграфіі, слоўнік [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://karotkizmest.by/беларуская-літаратура/якуб-колас/прырода-ў-творчасці-якуба-коласа.html – Дата доступа: 05.10.2022.



Репозиторий ГрГМУ